УДК 94(476):323.17«1917»

**А. А. Райчонак**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (БДТУ)

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ПАСЛЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г.

У артыкуле разглядаецца гісарыяграфія беларускага нацыянальнага руху пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аналізуюцца падыходы прадстаўнікоў розных палітычных плыняў да асенсавання гістарычных падзей, што прывялі да рэалізацыі права беларускай нацыі на самавызначэнне. Вылучаюцца асноўныя накірункі, што існавалі ў беларускай гістарыяграфіі ў перыяд 1917–1927 гг.

The article discusses the historiography of the Belarusian national movement after the October Revolution. The approaches of representatives of various political trends to understanding the historical events led to the realization of the right to the Belarusian nation self-determination are analysed. The main areas existed in the Belarusian historiography in the period of 1917–1927 years are highlighted.

**Уводзіны.** Найважнейшай крыніцай у асвятленні пытання ідэалагічнай барацьбы ў працэсе станаўлення беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца літаратура, створаная прадстаўнікамі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху. Каштоўнасць іх творчасці абумоўліваецца тым, што яны не толькі з'яўляліся сведкамі тых гістарычных падзей, але непасрэдна ўплывалі на іх. З другога боку, гэтым абумоўлены і іх галоўны недахоп – суб'ектывізм у трактоўцы гістарычных падзей. Трэба зазначыць, што дадзены недахоп у меншай ступені закранае акалічнасці ідэйнай барацьбы вакол праблемы беларускай дзяржаўнасці.

**Асноўная частка**. Адно з першых выданняў, што выйшла ў 1917 г., – гэта брашура старшыні Рады Народных Міністраў БНР у 1918–1919 гадах, А. І. Луцкевіча – "Ekonomiinaja ewolucija i bielaruski ruch" ("Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух"), якая ўяўляе сабой рэферат, прачытаны ім у Беларускім Клубе ў Вільні 29.10.1917 г.[1].

Публікацыя цікава тым, што ў ёй не толькі падкрэсліваецца неабходнасць стварэння незалежнай дзяржаўнасці, але і аналізуюцца неабходныя для гэтага эканамічныя перадумовы. Увогуле А. Луцкевіч пакінуў пасля сябе даволі багатую літаратурную спадчыну, якая з'яўляецца важнай крыніцай у даследаванні не толькі праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці, але і беларускага нацыянальнага руху ўвогуле. Яго пяру, акрамя ўзгаданай працы, належаць: выдадзеная пад крыптонімам "А. І." брашура "Усходняя Беларусь: Статыстычныя і гістарычныя матэрыялы" [2] , дзе даецца аналіз абстаноўкі на ўсходзе Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, а таксама прыводзяцца 106 прозвішчаў дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, згрупаваных па прафесійнай і сацыяльнай прыкмеце; "Польская акупацыя на Беларусі" [3], якая распавядае пра беларуска-польскія дачыненні часоў савецка-польскай вайны; "Палітычныя лозунгі беларускага руху" , змешчаныя ў зборніку "Наша Ніва" [4], дзе падаецца эвалюцыя поглядаў прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху ў перыяд з 1916 па 1920 гг. і даецца характарыстыка першага этапа станаўлення беларускай дзяржаўнасці і напрамкі яе магчымага развіцця; " За дваццаць пяць гадоў" – фактычна першая спроба стварэння абагульняючай працы па гісторыі беларускага руху першай чвэрці XX стагоддзя, у якой ён сцвярджае, што БССР толькі часткова здзейсніла дзяржаўны ідэал , а таксама дае тлумачэнне ролі ў дзяржаватворчым працэсе акта абвяшчэння незалежнасці БНР [5]. Таксама мае цікавасць дзённік А. Луцкевіча [6] і "следчая справа Антона Луцкевіча" [7], у якой змяшчаюцца яго ўласнаручныя паказанні, якія ўтрымліваюць шмат звестак, што не ўвайшлі ў іншыя выданні.

Цікавасць выклікаюць і публікацыі Я. Я. Варонкі, які з лютага па ліпень 1918 г. з'яўляўся старшынёй Народнага сакратарыята Беларусі, а са снежня 1918 г. па красавік 1920 г. – міністрам беларускіх спраў і членам кабінета міністраў Літвы. Апошняе надавала пэўную афарбоўку яго творам. У кніжках "Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции: Ист.-полит. очерк" [8] і "Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд" [9] ён выступае прыхільнікам канцэпцыі "двух ворагаў" – Польшчы і Расіі, якія ў аднолькавай ступені пагражаюць дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

Знайшла сваё адлюстраванне праблема беларускай дзяржаўнасці і ў працах актыўнага дзеяча нацыянальнага руху, прэм'ер-міністра ўрада БНР у 1923–1925 гг. А. І. Цвікевіча.

У брашуры – "Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики" [10] ён дае сціслы аналіз перадумоў абвяшчэння БНР, а таксама характарызуе развіццё беларускага руху. У якасці прадмовы да гэтай брашуры змешчаны артыкул М. Доўнар-Запольскага.

У палітычным нарысе "Беларусь" [11], А. Цвікевіч развівае папярэднія палажэнні, пры гэтым большы ўхіл робіць у бок разгляду адносін паміж Беларуссю, Расіяй і Польшчай.

Але найбольш грунтоўнай сярод разглядаемых намі прац з'яўляецца кніга "Адраджэнне Беларусі і Польшча" [12], у якой аналізуецца перыяд з 1772 па 1920 год. У выніку дадзенага аналізу аўтар прыходзіць да высновы, што Беларусь – цалкам самабытны край, і таму, як і іншыя народы, беларусы маюць права на стварэнне ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці, якая павінна пазбавіць беларусаў ад залежнасці і пакласці канец анексійным памкненням з боку суседзяў.

Таксама мае прамое дачыненне да разглядаемай тэмы кніга А. Цвікевіча "Западно-руссизм" [13], у якой ён разглядае ўплыў, які аказала дадзеная ідэалогія на працэс развіцця нацыянальнага руху і станаўленне беларускай дзяржаўнасці.

Разгляду беларуска-польскіх дачыненняў прысвечана кніга К. Езавітава "Беларусы і палякі. Дакументы і факты з гісторыі акупацыі Беларусі палякамі ў 1918–1919гадах" [14] , якая складалася з дзвюх частак. Першая была прысвечана беларуска-польскім адносінам, а другая складалася з пададзеных у храналагічным парадку 33 дакументаў, прысвечаных польскаму гвалту на Беларусі.

У 1918 годзе патрыярхам беларускай гістарычнай навукі М. В. Доўнар-Запольскім была напісана невялічкая брашура – "Асновы дзяржаўнасці Беларусі" [15], перакладзеная на розныя мовы і разасланая прадстаўнікам БНР за мяжой. Гэтая брашура служыла ідэйным абгрунтаваннем права беларусаў на ўтварэнне ўласнай дзяржаўнасці.

Праблемы беларускай дзяржаўнасці разглядаліся ім і ў наступных працах. У прыватнасці, гэтаму прысвечана глава "Барацьба за дзяржаўнасць" змешчаная ў "Гісторыі Беларусі" [16]. У ёй гісторык выводзіць беларускую дзяржаўнасць з шырокага, у першую чаргу сялянскага, нацыянальнага руху. Характарызуючы ўтварэнне БССР, ён зазначае: "Так пад савецкай [эгідай] адлілася беларуская дзяржаўнасць, класавыя пошукі пераважнай масы насельніцтва атрымалі сваё прызнанне." Зразумела, такі падыход не мог задаволіць бальшавіцкае кіраўніцтва. Кніга была абвешчана маніфестам нацыяналдэмакратызму, і рукапіс надоўга быў схаваны ў архіве.

Акрамя гэтага, можна ўзгадаць публікацыі В. Гадлеўскага, М. Краўцова, А. Станкевіча, якія ў розных аспектах закранаюць праблему пошуку шляхоў для ўвасаблення беларускай дзяржаўнасці [17].

Сярод прац, якія выйшлі ў той час, таксама цікавасць выклікаюць кнігі Я. Канчара і Ф. Турука, якія не з'яўляліся дзеячамі БНР, але непасрэдна ўдзельнічалі ў беларускім руху. Хаця яны па сваіх поглядах былі бліжэй да прадстаўнікоў камуністычнага напрамку, але іх пазіцыя мела і значныя разыходжанні з апошнімі.

Асаблівую цікавасць выклікае спадчына непасрэднага ўдзельніка падзей і старшыні Беларускага абласнога камітэта (БАК) Я. Канчара. У 1918 годзе выходзіць яго нарыс "Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов" [18]. У ім даецца падрабязнае апісанне І Усебеларускага з'езда з пункту гледжання яго непасрэднага арганізатара і ўдзельніка. На аўтарскую характарыстыку падзей, безумоўна, уплывала ўласная палітычная пазіцыя (Я. Канчар быў прыхільнікам аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Федэрацыі), што прадвызначыла адмоўную ацэнку дзеянням як прыхільнікаў абвяшчэння незалежнасці, так і мінскіх бальшавікоў, якія разагналі з'езд.

У кнізе Я Канчара – "Белорусский вопрос" [19] закранаецца шырокае кола пытанняў. Аўтар спрабуе асвятліць беларускі рух з усіх бакоў. Таму тут змяшчаюцца і статыстычныя даныя, і гістарычны агляд, і аналіз культурных асаблівасцяў беларускага народа. Але галоўную ўвагу аўтар надае разгляду беларускага нацыянальнага руху, вылучэнню яго асноўных патрабаванняў і абгрунтаванню права беларускага народа на самавызначэнне.

Што тычыцца працы Ф. Турука "Белорусское движение" [20], то ў ёй даецца кароткі агляд беларускага нацыянальнага руху, асобныя главы прысвечаны ўтварэнню БНР і БССР, даецца іх агульная характарыстыка і напрамак развіцця. Акрамя аўтарскага тэксту, у ёй маецца дадатак у выглядзе 31 дакумента. Для кнігі характэрна дыферэнцыяцыя беларускіх партый па іх блізкасці да РКП(б).

Літаратура, створаная прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху, мае велізарнае значэнне для вывучэння першага этапа стварэння беларускай дзяржаўнасці. Напісаная непасрэднымі ўдзельнікамі лёсавызначальных для беларускай дзяржаўнасці падзей, нягледзячы на пэўны суб'ектывізм у выкладанні тых ці іншых эпізодаў, яна ўтрымлівае не толькі каштоўныя звесткі, але і дае магчымасць зразумець усю разнастайнасць і складанасць падыходаў розных палітычных колаў да праблемы стварэння беларускай дзяржаўнасці.

Інакш ацэньваюцца падзеі ў артыкулах і кнігах прадстаўнікоў бальшавіцкай плыні, якія выйшлі ў БССР у 20-х гадах. Для іх характэрна непрыняцце іншых поглядаў на працэс стварэння беларускай дзяржаўнасці. Калі напачатку 20-х гадоў дапушчаўся яшчэ пэўны плюралізм, то напрыканцы ўсе прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху, якія не перайшлі на пазіцыі камуністычнай партыі, пачынаюць агульна абвінавачвацца ў контррэвалюцыйнасці.

Але, нягледзячы на вышэй сказанае, менавіта ў гэтыя гады быў закладзены падмурак савецкай гістарыяграфіі дзяржаўнасці Беларусі. Першынство належыла першаму кіраўніку ўрада БССР З. Х. Жылуновічу. На працягу 1922–1928 гадоў у часопісе "Полымя" ім быў надрукаваны цэлы шэраг артыкулаў, прысвечаных вышэйадзначанай праблематыцы. Галоўная каштоўнасць дадзеных публікацый, на наш погляд, у тым, што яны закранаюць амаль усе аспекты дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі. Напісаныя непасрэдным удзельнікам падзей, яны паказваюць развіццё беларускага нацыянальнага руху з пункту гледжання прадстаўнікоў яго левага крыла. Яму ж належыць артыкул "Люты – Кастрычнік у беларускім нацыянальным руху" [21]. Змешчаны ў зборніку "Беларусь", ён прысвечаны праблеме размежавання беларускага нацыянальнага руху і выкрышталізацыі палітычных патрабаванняў розных яго накірункаў.

Увогуле дадзены зборнік выпушчаны да пяцігоддзя абвяшчэння БССР, змяшчае цэлы шэраг артыкулаў, прысвечаных розным бакам дзяржаўна-нацыянальнага будаўніцтва. У ім жа змешчаны артыкул В. Г. Кнорына "Камуністычная партыя на Беларусі" [22], у якім аўтар спрабуе прааналізаваць як станоўчыя, так і адмоўныя бакі дзейнасці кампартыі на Беларусі, адносячы да апошняга фактычнае ігнараванне беларускага нацыянальнага пытання ў 1917–1918 гадах Паўночна-Заходнім камітэтам РКП(б).

В. Г. Кнорын таксама прысвяціў шмат публікацый і іншым пытанням партыйнага і дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР. Характарызуючы яго працы, трэба зазначыць, што пытанне пабудовы беларускай дзяржаўнасці ён разглядае выключна праз прызму класавага падыходу і камуністычнай ідэалогіі. Нягледзячы на значную эвалюцыю ў сваіх поглядах – ад адмаўлення існавання беларускай нацыі да прызнання за беларусамі права на самавызначэнне, ён разумеў гэтае самавызначэнне выключна на класавай аснове і ідэалагічным грунце бальшавізму. Стварэнне БССР разглядаў як апагей развіцця беларускага нацыянальнага руху і як адзіную магчымую форму рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Ставіўся крайне негатыўна да іншых поглядаў на зазначаныя працэсы, залічваючы ў стан контррэвалюцыянераў усіх, хто не падзяляў поглядаў бальшавікоў [22].

Прыблізна тыя ж погляды былі характэрны і для А. Чарвякова. У кнізе "За Савецкую Беларусь" [23] сярод іншых пытанняў ім разглядаецца і праблема стварэння беларускай дзяржаўнасці. Як і ў працах В. Кнорына, тут назіраецца прыярытэт класавых пытанняў над нацыянальнымі. Рэакцыйным падаецца не толькі імкненне да незалежнасці, але і да аўтаноміі Беларусі, а I Усебеларускі з'езд, на думку аўтара, складаўся выключна з ворагаў савецкай улады. Але тут трэба зазначыць, што, нягледзячы на пэўнае падабенства ў падыходах, А.Чарвякоў і В. Кнорын з'яўляліся прадстаўнікамі розных плыняў у ВКП(б).

Апошняй у дадзеным шэрагу прац можа лічыцца артыкул Г. Парэчына "Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі" [25]. Фактычна гэта першая абагульняючая праца прадстаўніка савецкага кірунку па гісторыі развіцця і эвалюцыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. У ёй разглядаецца перыяд ад XIX стагоддзя па 1919 год, прасочваецца паслядоўнае развіццё ідэі беларускай дзяржаўнасці ад патрабавання аўтаноміі да патрабавання незалежнасці. У ёй ёсць і недахопы, абумоўленыя ідэалагічнымі патрабаваннямі. Так, БНР характарызуецца як "буржуазна-абшарніцкая" дзяржава, а БССР як "вольная, незалежная савецкая дзяржава" , што відавочна з'яўляецца перабольшваннем.

**Заключэнне**. Характарызуючы перыяд 20-х гадоў увогуле, можна зазначыць, што яму ўласціва паступовая эвалюцыя ад мірнага суіснавання розных думак і поглядаў на праблему стварэння беларускай дзяржаўнасці да панавання бальшавіцкага погляду на дадзеную праблему і пачатак барацьбы з любымі праявамі іншадумства.

З агульна-метадалагічных праблем, характэрных для гэтага перыяду, на наш погляд, галоўнымі з'яўляюцца наступныя: блізкая адлегласць публікацый ад падзей, якія ў іх аналізаваліся, што ў поўнай меры не давала магчымасці ацаніць гістарычную значнасць тых ці іншых фактаў, і пэўная ідэалагічная ангажаванасць іх аўтараў, што ў сваю чаргу, замінала непрадузята ацэньваць як свае ўласныя дзеянні, так і дзеянні сваіх палітычных апанентаў. На нашу думку, тут да месца будзе прыгадаць выказванне А. Луцкевіча з прадмовы да кнігі "За дваццаць пяць гадоў": "Дык няхай даследчыкі нашага адраджэння не шукаюць у гэтых успамінах адказу на зусім натуральнае пытанне: чаму тое ці іншае сталася, бо выкрыць прычыну гэтага – задача гісторыка".

## Літаратура

1. Luckiewiи A. Ekonomiиnaja ewolucija i bielaruski ruch. (Referat, иytany u Bielaruskim Klube 28.X.1917). Sl. 1917.

2. А. І. Усходняя Беларусь: Статыстычныя і гістарычныя матэрыялы. Менск: Выданне Народнага Сэкрэтэрства Міжнародавых Справаў. 1918. 13 с.

3. А. І. Польская акупацыя на Беларусі. 1920.

4. Новіна Ант. (Луцкевіч А.). Палітычныя лозунгі беларускага руху // Зборнік "Наша Ніва". Вільня: Бел. выд. т-ва, 1920. С. 2–14.

5. Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў / 1903–1928: Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада. Вільня. Белар. выдавецкае тав-ва, 1928. 52с.

6. Луцкевіч А. Дзённік / Публікацыя А. Сідарэвіча // Полымя. 1991, №4. С. 215–224, №5 С. 168–192.

7. «Дело» Антона Луцкевича // Становление и крушение однопартийной системы в СССР. Гомель 1995. 506 с. С. 266–320.

8. Воронко И. Я. Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции: Ист.-полит. очерк. Ковна, 1919. 59 с.

9. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. Коўна 1920. 29 с.

10. Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. Киев. 1918. 16 с.

11. Цвикевич А. Беларусь: Политический очерк. Берлин. 1919.

12. Цвікевіч А. Адрадженне Беларусі і Польшча. Мінск; Вільня; Берлін: выд. т-ва “Вызваленне”. 1921. 192 с.

13. Цвікевіч А. «Заподно-русизм»: нарысы з гісторыі грамадзянскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пач. XX ст. 2-е выд. Мінск, 1993.

14. Езовитов К. Белорусы и Поляки: Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 годах. Ковна. Изд-во им. Ф. Скорины, 1919. 124 с.

15. Доўнар-Запольскі М. В. Асновы Дзяржаўнасці Беларусі. Мінск: ВПП Дзяржэканомплана Рэспублікі Беларусь, 1994. 23 с.

16. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мінск: БелЭН, 1994. С. 468–496

17. Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця ў Мінску ў 1917–1918 гг. // Беларуская крыніца. 1934. 2–29 красавіка. (перадрук: Спадчына. 1997. №5. С. 18–39); Краўцоў М. Усебеларускі з'езд 1917 г. // Беларускі звон. 1921. 9–30 верасня. (скарочаны перадрук: Наша Ніва. 1997. 20 кастрычніка); Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1935.

18. Канчер Е. С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Часть II. История возникновения и деятельность организаций. Выпуск первый // Неман. 1993, № 1 С. 136–167.

19. Канчер Е. С. Белорусский вопрос. Сборник статей. Петроград, 1919.

20. Турук Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов. М.: Госиздат, 1921. 144 с.

21. Жылуновіч З. Люты – Кастрычнік у беларускім нацыянальным руху // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і вызваленчага руху. Мінск, 1924. С. 182–194.

22. Кнорын В. Г. Камуністычная партыя на Беларусі // Беларусь. С. 215–222.

23. Кнорин В. Революция и контрреволюция в Белоруссии. Ч.1. Смоленск. 1920; Кнорин В. 1917 год в Беларуси и на Западном фронте. Минск, 1925; Кнорин В. За культурную революцию. Минск, 1928.

24. Чарвякоў А. За Савецкую Беларусь. Менск, 1927.

25. Парэчын Г. Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі // Запіскі адзелу гуманітарных навук. Працы кафедры сучаснага права. Т. 1. Мінск, 1929. С. 1–35.

*Пастуміў 30.03.2014*